# § 29. Кітай

**1644 г.**

**Успомніце.** *Якімі былі асаблівасці геаграфічнага становішча Кітая? З якімі праблемамі Кітай часта сутыкаўся на поўначы краіны? Як кітайцы стараліся вырашыць гэтыя праблемы яшчэ ў старажытнасці?*

У XVI–XVIII стст. Кітай быў вельмі багатай і густанаселенай краінай. Ён праводзіў актыўную знешнюю палітыку ў краінах Усходняй Азіі. Пры гэтым кітайцы свядома абмяжоўвалі кантакты з Еўропай.

**Вы даведаецеся.** *Прычыны заняпаду дынастыі Мін і ўсталявання іншаземнага панавання. Чаму Кітай пачаў праводзіць палітыку ізаляцыі ад Еўропы. Асаблівасці культуры і рэлігіі кітайцаў.*



260—262

Кітайскі імператар Даргон у імператарскім убранні. *Невядомы мастак.* XVII ст.

**1. Заваяванне Кітая маньчжурамі.** Амаль тры стагоддзі Кітаем кіравала дынастыя Мін (1368—1644). Першыя два стагоддзі былі перыядам адноснага міру, росквіту рамёстваў і мастацтваў.

Напачатку XVII ст. краіна ўступіла ў перыяд паступовага заняпаду. Войны дынастыі Мін з суседзямі патрабавалі вялікіх выдаткаў. Таму правіцелі ўвесь час павялічвалі падаткі, якія цяжкім грузам кладзіся на плечы простых людзей. Незадаволенасць дынастыяй Мін у краіне ўсё больш і больш нарастала, выбухалі народныя паўстанні. У 1644 г. сяляне-паўстанцы захапілі Пекін — сталіцу імперыі Мін. Апошні імператар кіроўнай дынастыі апынуўся ў безвыходным становішчы і скончыў жыццё самагубствам.

Смутай і бязладдзем скарысталіся ваяўнічыя маньчжуры (карэннае насельніцтва Маньч-




Кітай у XVII–XVIII стст.

журыі; у наш час — Паўночна-Усходні Кітай). Яны напалі на Кітай з зямель, якія ляжалі на поўнач ад Вялікай кітайскай сцяны. Улетку ***1644 г.*** іх армія заняла Пекін, і маньчжурскі правадыр Даргон абвясціў уладу дынастыі Цын. Чужаземная дынастыя кіравала Кітаем да 1912 г.

264—266

Заваёўнікі разглядалі кітайцаў як людзей другога гатунку, ставіліся да іх пагардліва і пыхліва. Забараняліся шлюбы паміж кітайцамі і маньчжурамі. У знак пакоры кітайскія мужчыны мусілі заплятаць валасы ў даўгія коскі, як гэта рабілі заваёўнікі. Маньчжуры жылі асобна ад кітайцаў у спецыяльных раёнах. Усё гэта прыводзіла да таго, што кітайцы не раз выступалі супраць маньчжураў са зброяй у руках.

Усталяванне маньчжурскага панавання ў Кітаі зусім не азначала, што ўсё кітайскае было адпрэчана. Узроўнем свайго культурнага развіцця маньчжуры значна саступалі кітайцам. Не дзіва, што з цягам

часу яны ўспрынялі кітайскія звычаі, культуру і нават забыліся сваю родную мову.

Сістэма кіравання краінай істотна не змянілася. Розніца была толькі ў тым, што вышэйшыя службовыя пасады ў імперыі займалі не кітайцы, а маньчжуры. У правінцыях, як і раней, кіравалі чыноўнікі (мандарыны) кітайскага паходжання.

257—258

Правіцелі дынастыі Цын вялі войны, у выніку якіх уладанні Кітая значна пашырыліся. З XVII ст. даннікам цынскага Кітая зрабілася Карэя. А напрыканцы XVIII ст. дынастыя Цын кантралявала Манголію, Тыбет, Джунгарыю і іншыя вобласці. Насельніцтва Кітая вырасла да 300 млн чалавек, што перавышала колькасць насельніцтва тагачаснай Еўропы.

258—260

**2. Абмежаванне кантактаў з еўрапейцамі.** Вонкава Кітай у перыяд дынастыі Цын выглядаў казачна багатай і магутнай краінай. Маньчжурскія ўлады першы час добразычліва ставіліся да кантактаў з еўрапейцамі. Караблям «заходніх варвараў» (так у Кітаі называлі еўрапейцаў) было дазволена заходзіць у кітайскія парты і весці гандаль у гарадах. Праўда, кітайцаў не надта цікавілі заморскія тавары. Яны прапаноўвалі еўрапейцам цудоўныя тканіны, фарфор і фаянс, патрабуючы ўзамен толькі золата і срэбра — усё астатняе яны мелі.

У другой палове XVII ст. каталіцкія місіянеры пачалі прапаведаваць у Кітаі хрысціянства. Аднак з цягам часу правіцелі дынастыі Цын угледзелі пагрозу ў асобе далёкай і невядомай Еўропы. Таму ў сярэдзіне XVIII ст. яны забаранілі гандаль з еўрапейцамі ва ўсіх кітайскіх гарадах, акрамя Гуанчжоу на поўдні краіны. З гэтага часу Кітай стаў праводзіць палітыку ізаляцыі ад Еўропы. Нават у Гуанчжоу еўрапейцам забаранялася кантактаваць з мясцовым насельніцтвам.

*Як вы думаеце, як развіваўся б Кітай, калі б маньчжурам не ўдалося яго заваяваць?*

Еўрапейскія дзяржавы не жадалі мірыцца з падобнымі абмежаваннямі. Яны імкнуліся ўсталяваць з Кітаем дыпламатычныя стасункі, гэта значыць «адкрыць» Кітай, каб весці з ім нічым не абмежаваны гандаль. З гэтаю мэтай у 1792 г. Англія накіравала ў Пекін спецыяльную місію (дэлегацыю). Англійскі пасол прывёз у дар кітайскаму імпе-



Першая брытанская дыпламатычная місія ў Кітаі. Карыкатура 1792 г.

ратару паветраны шар, тэлескоп, мікраскопы, насценны і кішэнны гадзіннікі і духавыя стрэльбы. Місія неспадзявана скончылася поўным правалам. Улады ўспрынялі англічан як «носьбітаў даніны» з васальнай краіны, а іх прапановы расцанілі як неразумныя і нахабныя. Тым не менш «адкрыццё» Кітая было толькі пытаннем часу.

*Як вы лічыце, чаму кітайцы ўспрынялі англічан як «носьбітаў даніны»?*

**3. Развіццё культуры.** Нягледзячы на вялікія дасягненні старажытнай кітайскай цывілізацыі, у Новы час Кітай быў адсталаю краінай. Еўропа значна пераўзыходзіла яго ўзроўнем эканамічнага і навукова-тэхнічнага развіцця.

Уяўленні кітайцаў пра Сусвет заставаліся такімі ж, як і ў старажытнасці: над усім пануе бязмежнае ўсёмагутнае Неба, якое назірае за жыццём людзей. Унізе ляжыць Зямля, у цэнтры якой знаходзіцца Пасярэдняя дзяржава, або Паднябесная, гэта значыць Кітай. Тых жа, хто жыў па-за межамі Паднябеснай, лічылі варварамі.

Значнае месца ў духоўным жыцці кітайцаў у эпоху Цын займалі паданні пра багоў, вера ў добрых і злых духаў. Ад нараджэння і да самай смерці жыццё кітайца было поўнае забабонаў і рэлігійных міфаў. Духам



Даоская багіня даўгалецця Ма-гу. Скрутак XVIII ст.



Даоскі манах. Мастак *Кунь Цань.* Каля 1673 г.

маліліся і пакланяліся, здзяйснялі ахвярныя паднашэнні, заклікалі іх, просячы абароны і заступніцтва.

Немагчыма нават прыблізна падлічыць, колькі багоў і духаў «абслугоўвалі» кітайскі народ. Усё, што адбывалася навокал, звязвалася з дзейнасцю духаў або нейкіх таямнічых сіл. Усе элементы расліннага і жывёльнага свету, нават камяні, мелі сваіх духаў.

Асаблівае значэнне ў Кітаі набыў культ продкаў. Кітайцы верылі ў існаванне душы чалавека пасля смерці і ў яе ўплыў на лёс жывых сваякоў. Таму яны абагаўлялі і шанавалі агульнага продка роду па мужчынскай лініі. Самая страшная абраза, якую толькі можна было нанесці кітайцу, — гэта разбурэнне магіл яго продкаў. Але хоць кітайцы і верылі ў замагільнае жыццё, яны аддавалі перавагу зямному. «Лепш быць жывым бедняком, чым мёртвым імператарам», — кажа кітайская прыказка.

Вялікі ўплыў на духоўнае жыццё кітайцаў у эпоху Цын аказвалі тры рэлігійныя вучэнні: канфуцыянства, даасізм і будызм.

Канфуцыянства патрабавала ад кітайца паслушэнства старэйшым у сям'і і грамадстве. Даасізм выхоўваў у ім веру ў звышнатуральныя сілы, а будызм — абыякавасць да радасцяў жыцця. Але, як правіла, кітайцы адначасова вызнавалі ўсе тры рэлігіі.

У адпаведнасці з вучэннем Канфуцыя асоба імператара адыгрывала асаблівую ролю. Правіцель лічыўся адначасова бацькам і маці кітайскай нацыі, якая разглядалася як адна вялікая сям'я. Усім прадпісвалася выказваць да яго сыноўскую любоў і пашану. Сярод шматлікіх тытулаў імпе-

ратара быў і такі: «Сусветны манарх і гаспадар Сусвету, якому мусяць усе падпарадкоўвацца».

**Кітайскі этыкет**

Вялікае значэнне ў жыцці кожнага кітайца, у тым ліку і простага чалавека, мелі шматлікія традыцыйныя цырымоніі. Пра выкананне цырыманіялу існуе шмат народных выслоўяў. Адно з іх кажа: «Чалавек, калі нават прыгожа гаворыць, але не выконвае правілы ветлівасці, — горшы ад жывёлы».

Прынцып сыноўскай паслухмянасці быў асновай адносін паміж бацькам і дзецьмі. Папулярнымі былі такога кшталту прыказкі: «Калі сын ратуе жыццё бацькі, страчваючы сваё ўласнае, — гэта самая шчаслівая смерць», «Усялякі злодзей пачаў з таго, што зрабіўся дрэнным сынам».

*Такім чынам, заваяванне Кітая маньчжурамі было найважнейшай падзеяй гісторыі гэтай краіны. Кітай праводзіў актыўную знешнюю палітыку, але імкнуўся да абмежавання кантактаў з еўрапейцамі. Уяўленні кітайцаў пра навакольнае асяроддзе, іх духоўны свет і культура насілі глыбока традыцыйны сярэднявечны характар.*

***Ключавыя словы:*** *дынастыя Мін, дынастыя Цын, імператар, культ продкаў, канфуцыянства.*

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце прычыны незадаволенасці насельніцтва Кітая палітыкай дынастыі Мін.
2. Ахарактарызуйце з выкарыстаннем тэксту параграфа і ілюстрацыйнага матэрыялу заваяванне Кітая маньчжурамі. Вызначце, як змянілася становішча кітайскага народа.
3. Чаму маньчжурскія правіцелі бачылі ў Еўропе пагрозу? Як еўрапейскія краіны ставіліся да Кітая?
4. Раскажыце пра тое, як уяўлялі кітайцы навакольны свет.
5. Ахарактарызуйце духоўнае жыццё ў Кітаі пры маньчжурах.
6. Патлумачце асаблівасці рэлігійнага жыцця ў Кітаі.